«Ленінскі лозунг «Вучыцца, вучыцца і вучыцца» застаецца і сёння самым важным, самым актуальным лозунгам жыцця».

*(З прамовы таварыша Л. І. БРЭЖНЕВА на Усесаюзным злёце студэнтаў).*

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 31 САКАВІКА 1977 г.

№ 11 (1161)

Цана 2 кап.

# МЕРА АДКАЗНАСЦІ

СВЯТУ КАСТРЫЧНІКА — ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ! 60

За апошні час рады камуністаў універсітэта значна папоўніліся за лік студэнтаў — членаў і кандыдатаў у члены КПСС, — паступаючых на першы курс з аўдыторый падрыхтоўчага аддзялення. У нядаўнім мінулым гэта маладыя перадавікі вытворчасці, працаўнікі палёў і ферм, воіны — выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі, сваёй прыкладнай працай заваяваўшыя права быць пасланымі працоўнымі і воінскімі калектывамі на вучобу ў вышэйшую навучальную ўстанову. Сёння мы маем нямала прыкладаў, калі яны, несучы вялікую маральную адказнасць за аказанае давер'е, паказваюць высокія ўзоры камуністычных адносін да працы, якая для студэнта—гэта выдатная і добрая вучоба, актыўная навуковая і грамадская дзейнасць. У сценах універсітэта такія студэнты - камуністы на працягу ўсяго перыяду навучання захоўваюць сваю працоўную загартоўку, выключную працавітасць і становяцца высокакваліфікаванымі спецыялістамі, у якіх мае патрэбу народная гаспадарка.

Аднак побач з гэтым у нас, на жаль, нярэдкія выпадкі, калі ў залікоўцы студэнта, члена партыі, паяўляецца не адна (заўважым, выпадковая), а дзве, тры, а часам і чатыры тройкі, якія з сесіі ў сесію атрымліваюць у ёй пастаянную праліску. Адбываецца як бы пераражэнне перадавіка вытворчасці ў мінулым у пасрэднага, адстаючага студэнта сёння.

Сёння студэнт-камуніст у акадэмічнай групе, а тым больш на курсе — з'ява не адзінкавая. На гістарычным факультэце, напрыклад, партыйная праслойка складае 14 працэнтаў ад агульнай колькасці студэнтаў. Поўнасцю зразумелай становіцца тут трывога партыйнага бюро факультэта, партгруп курсаў і аддзяленняў, выкліканая тым фактам, што па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі на долю студэнтаў-камуністаў прыпадае 54 працэнты нездавальняючых і толькі 13 працэнтаў выдатных адзнак, атрыманых студэнтамі на факультэце. Якую ж авангардную ролю ў авалоданні ведамі можа адыгрываць камуніст, які мае ў сваім «актыве» толькі «здавальняюча» і «нездавальняюча»?

А між тым статутныя патрабаванні абавязваюць члена партыі служыць прыкладам камуністычных адносін да працы, павышаць свой ідэйны ўзровень, авалодваць марксісцка-ленінскай тэорыяй. Чаму ж маладыя камуністы, прыйшоўшы на факультэт, нярэдка перастаюць свята выконваць гэты радок Статута партыі? На апошнім сходзе маладых камуністаў гістфака быў дадзен, на наш погляд, вычарпальны адказ: прыніжана патрабавальнасць студэнтаў-камуністаў як да сваёй вучобы, так і да вучобы сваіх таварышаў па партыйнай групе, маюць месца абыякавыя адносіны да выканання свайго партыйнага абавязку.

Сур'ёзную заклапочанасць выклікаюць выпадкі павярхоўнага вывучэння камуністамі грамадскіх дысцыплін, такіх, як гісторыя КПСС, этыка, гісторыя філасофіі і інш. Пытанне адносін камуніста да вучэбнага працэсу нярэдка ўскладняецца яшчэ і тым, што многія напрамкі грамадскай работы ўзначальваюцца студэнтамі, членамі партыі. Некаторыя камуністы маюць не адно, а два і больш сур'ёзных даручэнняў, якія практычна пазбаўляюць яго магчымасці глыбока засвойваць вучэбную праграму.

Узнікае, напрыклад, сітуацыя, калі камуніст В. Янчук, з'яўляючыся сакратаром камсамольскай арганізацыі аддзялення філасофіі, атрымлівае чатыры здавальняючыя адзнакі. Такім чынам, паспяховасць нашых актывістаў не заўсёды можна паставіць у прыклад адстаючым.

Пасля сур'ёзнай і прынцыповай размовы на сходзе маладых камуністаў, мы лічым, многія студэнты факультэта, маючыя партыйны білет ці кандыдацкую картачку, павінны ў корані перагледзець свае адносіны да вучэбнага працэсу, удзелу ў грамадскім жыцці, дысцыпліны. Тым больш, што ў нас ёсць на каго раўняцца, з каго браць прыклад. Гэта камуністы М. Герасімовіч, У. Паўлоўскі, М. Фурс, В. Зябко, Л. Бандэлікаў і іншыя, якія, узначальваючы адказныя ўчасткі грамадскай работы, паказваюць высокае стабільнае веданне вучэбных дысцыплін.

**У. КАРАГІН,**
**А. КІШКЕВІЧ,**
**У. ВАСЮЧОНАК,**
**партгрупоргі гістарычнага факультэта.**

## Наперадзе— агляд

**ЯК РЫХТУЮЦЦА ШТАБЫ «КП» ФАКУЛЬТЭТАЎ ДА АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКАГА АГЛЯДУ-КОНКУРСУ «КАМСАМОЛЬСКІХ ПРАЖЭКТАРАЎ»?**

Гэтаму пытанню было прысвечана сакавіцкае пасяджэнне сектараў галоснасці факультэцкіх «КП». Праводзіў яго старшыня «КП» журфака А. Зельдзін. У ходзе пасяджэння ўдзельнікі абмяняліся вопытам работы, адзначылі істотныя недахопы, прааналізавалі сакавіцкія нумары «КП». У першую чаргу былі адзначаны нумары «КП» радыёфізічнага, біялагічнага і юрыдычнага факультэтаў, дзе выпускаюцца аператыўныя, сатырычныя, аформленыя з добрым густам «Камсамольскія пражэктары». Яны закранаюць пытанні наведвання студэнтамі заняткаў, крытыкуюць хвасцістаў, змяшчаюць вынікі рэйдаў па праверцы санітарнага стану інтэрнатаў. Сярод лепшых—і «КП» журфака.

Асобна трэба сказаць пра справы «пражэктарыстаў» радыёфізічнага факультэта. На апошнім пасяджэнні штаба «КП» універсітэта яны атрымалі ў свой адрас крытычныя заўвагі. І вось вынік—іх нумары адны з лепшых. Студэнты-радыёфізікі ўлічылі ўсе недахопы, значна павысілі баявітасць і змястоўнасць сваіх выступленняў. Вось—апошні нумар іх «КП». Радыёфізікі прайшліся па аўдыторыях з фотаапаратам і, як кажуць, «увекавечылі» надпісы на партах. Да гэтых «шэдэўраў» падабралі сатырычныя вершаваныя подпісы. І нумар адразу прыцягнуў агульную ўвагу.

У цэлым работа сектараў галоснасці «КП» факультэтаў за мінулы месяц пакінула добрае ўражанне. Вось толькі што думаюць сабе члены «КП» хімфака і філфака, якія не толькі не прадставілі ніводнага нумара, але нават «забыліся» прыслаць на пасяджэнне сваіх прадстаўнікоў?

**Л. АСТАПОВІЧ.**

СПРАВЫ камсамольскія

# ЗАЎСЁДЫ РАЗАМ

**Пытанне аб умацаванні сувязей камсамольскіх арганізацый супрацоўнікаў і студэнтаў было абмеркавана на пасяджэнні камітэта камсамола хімічнага факультэта. Падрабязней аб наладжванні гэтых сувязей расказаў навуковы супрацоўнік кафедры неарганічнай хіміі, кандыдат хімічных навук, намеснік сакратара камітэта камсамола па шэфскіх сувязях С. МАЛЬЧАНКА.**

— На мінулагоднім справаздачна-зыбарным сходзе камсамольцаў хімфака быў створан аб'яднаны камітэт камсамола. Сюды ўвайшло, акрамя студэнтаў, сем супрацоўнікаў, з іх чатыры—кандыдаты навук. Усе яны вопытныя выкладчыкі, добрыя арганізатары. Таму мы заўсёды ў курсе спраў груп курсаў і факультэта. Сакратаром стаў кандыдат хімічных навук А. Скарапанаў.

Сумесна з дэканатам мы кантралюем наведванне заняткаў. Дапамагаем у выпуску «Камсамольскага пражэктара» па выніках такіх рэйдаў. Гэта работа акадэмічнага сектара.

Начальнік штаба працоўных спраў С. Альфер — адзін з нашых супрацоўнікаў. Пад яго кіраўніцтвам ужо зараз вядзецца падрыхтоўка да наступнага працоўнага семестра. Летам у кожным будатрадзе будзе працаваць наш выкладчык.

Далей раскажу крыху аб шэфскай рабоце камітэта камсамола хімфака. У час «Дзён студэнтаў Міншчыны» мы арганізавалі сем экскурсій па хімфаку. Школьнікам 36-й і 65-й школ г. Мінска расказалі аб сваім факультэце, пазнаёмілі з асноўнымі напрамкамі навуковых работ, з праблемамі, над якімі працуюць мае калегі. Госці наведалі лабараторыі высокамалекулярных злучэнняў, аналітычнай хіміі.

Такая работа вядзецца рэгулярна. У 89-й і 90-й падшэфных школах створаны і працуюць кабінеты хіміі, выпускаецца насценгазета «Юны хімік».

Камсамольцы-выкладчыкі факультэта пераймалі вопыт Маскоўскага інжынерна-фізічнага інстытута аб індывідуальным шэфстве ў студэнцкіх групах. На І—ІІІ курсах працуюць намеснікі куратараў груп з ліку супрацоўнікаў факультэта. Яны сочаць за паляпшэннем вучобы і адпачынку моладзі, кантралююць падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў, абавязкова прысутнічаюць на камсамольскіх сходах груп і аказваюць непасрэдную дапамогу камсамольскім бюро груп.

Поспехі сумеснай работы? Яны немалыя. У мінулым годзе па выніках сацыялістычнага спаборніцтва паміж камсамольскімі арганізацыямі універсітэта факультэт займаў 9-е і 10-е месцы, а сёлета—6-е. Актыўнасць у рабоце павышаецца. Галоўнае ж тое, што камітэт камсамола можа актыўна працаваць на працягу ўсяго года: і ў час сесіі і ў час летніх канікулаў.

**М. БАЖКО.**





**Адбылося размеркаванне пяцікурснікаў геаграфічнага факультэта. Больш за 130 выпускнікоў атрымалі ў гэтым годзе накіраванні на работу. У калектывы сярэдніх і васьмігадовых школ, навукова-даследчых устаноў і іншых прадпрыемстваў народнай гаспадаркі ўвальюцца маладыя спецыялісты з дыпломамі БДУ.**

**НА ЗДЫМКАХ: ідзе размеркаванне.**

**Фота А. НІКАЛАЙЧЫКА.**

## Студэнтка вучыцца і... выкладае

**СТУДЭНТКА IV КУРСА РУСКАГА АДДЗЯЛЕННЯ ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА МАРГАРЫТА ІОХЕС ВЫКЛАДАЕ РУСКУЮ МОВУ НА ПАДРЫХТОЎЧЫХ КУРСАХ НАШАГА УНІВЕРСІТЭТА.**

— Тэарэтычны матэрыял я стараюся засвоіць прама на лекцыі, — гаворыць Маргарыта Іохес. — Усе незразумелыя пытанні тут жа высвятляю ў выкладчыка. Літаратуру чытаю так: спачатку найбольш аб'ёмную, а перад экзаменам невялікія творы — вершы, драмы.

Грамадская работа? Яна вельмі дапамагае мне ў тым, што дае навыкі выкладання. Студэнтам трэба самім праяўляць больш актыўнасці: працаваць на дзіцячых пляцоўках, у піянерлагерах, у падшэфнай школе.

У будучым хацелася б займацца і навуковай дзейнасцю. Але тым, хто не хоча ісці ў школу пасля заканчэння універсітэта менавіта па гэтай прычыне, я скажу, што работа ў сярэдняй навучальнай установе—гэта абавязковы этап для філолага. Бо так ці інакш прыйдзецца выкладаць: выхоўваць калі не вучняў, дык будучых настаўнікаў.

**Л. ДЭМБОЎСКАЯ.**

**Народны кантроль у дзеянні**

# ПАРАДАК ПАВІНЕН БЫЦЬ

Камісія групы народнага кантролю БДУ правяла праверку інтэрнатаў №№ 5, 6, 7. Рэзультаты паказалі, што стан студэнцкіх інтэрнатаў у асноўным здавальняючы. Разам з тым, камісія адзначыла, што ў інтэрнаце № 5 слаба працуе студсавет: не наладжана дзяжурства, распарадак работы чытальных залаў не выконваецца, чытальныя залы 3 і 4 паверхаў працуюць нерэгулярна, дрэнна аформлен стэнд, які адлюстроўвае жыццё інтэрната.

Тут ёсць выпадкі няправільных адносін студэнтаў да грамадскай маёмасці: займаюцца прасаваннем у пакоях на паліраваных сталах, разбіраюць ложкі і на ложках — па некалькі матрацаў

У інтэрнаце № 7 не заўсёды аператыўна задавальняюцца заяўкі студэнтаў на рамонт разетак, мэблі, устаноўку радыёкропак. На кухнях інтэрнатаў не хапае гарэлак, няма ручак уключэння, разбіты вокны, у ленінскім пакоі на 5 паверсе электрасетка патрабуе рамонту. З гутаркі са студэнтамі выявілася, што за апошні час у інтэрнатах маюцца выпадкі, калі некаторыя студэнты знімаюць ручкі ўключэння гарэлкі для персанальнага карыстання. У інтэрнаце няма стэндаў, не аформлены ленінскія пакоі, холы, вучэбныя пакоі, не хапае каля 100 умывальнікаў, 150 душавых сетак.

Інтэрнат — 13-павярховы, але ліфт працуе ў адну змену. Не наладжана работа студсавета інтэрната, няма сістэматычнага дзяжурства (у дзень праверкі дзяжурства не было). Дрэнна аформлены стэнды, няма плана культурных мерапрыемстваў, графіка дзяжурстваў, плана работы санітарнай камісіі і г. д.

У інтэрнаце № 6 санітарны стан пакояў, калідораў, грамадскіх месц здавальняючы, маюцца пакоі, якія добра аформлены, утульныя, але іх недастаткова на 700 студэнтаў. У ленінскіх пакоях не хапае сталоў, у інтэрнаце няма актавай залы і бытавых пакояў.

Абмеркаваўшы вынікі праверкі стану інтэрнатаў на пашыраным пасяджэнні (прысутнічалі прадстаўнікі рэктарата, АГЧ, каменданты інтэрнатаў), група народнага кантролю БДУ рэкамендавала:

камітэту камсамола, прафкому універсітэта ўзмацніць работу сярод студэнтаў па выхаванню беражлівых адносін да сацыялістычнай маёмасці, сачыць за выкананнем правілаў паводзін у інтэрнаце;

прафкому, БДУ неабходна наладзіць кіраванне студсаветамі, сумесна з імі распрацаваць і правесці мерапрыемствы па навядзенню і падтрыманню парадку ў інтэрнатах, паляпшэнню санітарнага стану ў блоках, дзе жывуць замежныя студэнты, правесці па гэтых пытаннях сходы студэнтаў, якія пражываюць у інтэрнатах, і ў далейшым практыкаваць замацаванне за інтэрнатамі толькі аднаго ці двух факультэтаў;

студэнцкім саветам і камендантам інтэрнатаў даручана наладзіць і ўзмацніць кантроль за прапускной сістэмай у інтэрнатах і арганізацыяй дзяжурстваў па паверхах. Дэканам факультэтаў больш увагі трэба ўдзяляць падбору савецкіх студэнтаў для пражывання ў інтэрнатах № 5 і № 7;

каменданты інтэрнатаў павінны наладзіць строгі ўлік маёмасці, выдаваць яе ў адпаведнасці з нормамі, катэгарычна забараняць разборкі ложкаў, правяраць уцяпленне пакояў, канфіскаваць абагравальныя прылады;

групы народнага кантролю факультэтаў павінны сістэматычна праводзіць праверкі па пытаннях беражлівага карыстання дзяржаўнай маёмасцю, эканоміі электраэнергіі, вады;

АГЧ універсітэта патрэбна паклапаціцца аб забеспячэнні інтэрнатаў сантэхабсталяваннем, мэбляй, паляпшэнні работы ліфта, рамонце і радыёфікаванні пакояў.

**М. КНІГА,**
**кіраўнік сектара быту ГНК БДУ.**

# ЯКАСЦЬ — ЯК ТАЛЕНТ

**У характары кожнага чалавека заўсёды ёсць якая-небудзь адзіная, найбольш уласцівая яму рыса: сціпласць або цвёрдасць характару, упэўненасць у сваіх сілах або шчырасць душы. Але найбольш важнай чалавечай якасцю я лічу пачуццё адказнасці за свае справы. Гэта якасць — як талент. Здаецца, што менавіта такім талентам надзелен Анатоль Лабанок, студэнт III курса гістфака.**

**У камітэце камсамола факультэта яго ахарактарызавалі як «безадказнага таварыша», а сябры-аднакурснікі назвалі «душой калектыву».**

**Задушэўны чалавек — Анатоль. Ён умее прыцягваць людзей да сябе. У хлопца немалы вопыт грамадскай працы.**

**Перш чым паступіць у БДУ на гістарычны факультэт, Анатоль, як кажуць, паспрабаваў «свайго хлеба». Закончыўшы паспяхова сярэднюю школу ў Пухавіцкім раёне, ён пайшоў на Мінскі мотавелазавод, дзе працаваў слесарам, а потым токарам. Настойлівасць дапамагае Анатолю заваяваць першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве на званне лепшага токара цэха. Хутка сябры выбралі Анатоля камсоргам змены. Камсамольскія сходы, дапамога таварышам у працы, арганізацыя культурных мерапрыемстваў — усё гэта становіцца яго штодзённымі турботамі.**

**Пасля арміі, дзе Толя таксама быў камсоргам, — зноў завод. Тут яго рэкамендуюць кандыдатам у члены КПСС.**

**Думка аб вышэйшай адукацыі ва ўсе гэтыя гады не пакідала Анатоля Лабанка. І вось падрыхтоўчае аддзяленне БДУ, а праз год ён — паўнапраўны студэнт гістарычнага факультэта...**

**— Засумняваўся спачатку ў сваіх арганізатарскіх здольнасцях, калі выбралі членам камітэта камсамола гістфака, — прызнаецца Анатоль, — тут маштабы работы большыя.**

**Але сумненні былі толькі спачатку...**

**Калі ж Анатоль усё паспявае? Адказны за грамадска-палітычную і масавую работу ў інтэрнаце № 1, намеснік старшыні студсавета, член камітэта камсамола, ён, акрамя таго, добра вучыцца.**

**Напэўна кожны ўяўляе сабе, колькі патрэбна часу і адданасці, каб падрыхтаваць вечар адпачынку, арганізаваць сустрэчу, правесці агеньчык, уладкаваць пытанне з інтэрнатам.**

**І да ўсіх спраў — вялікіх і малых — Анатоль Лабанок заўсёды ставіцца прынцыпова і з вялікай адказнасцю.**

**А. БАШУН.**



Частыя госці на журфаку дзеячы культуры, кіно. Нядаўна першакурснікі першай групы сустрэліся з кандыдатам мастацтвазнаўчых навук Эміліяй Іванаўнай Шумілавай, якая расказала аб сучасным становішчы мастацтва ў краінах Захаду.

На здымку: **Э. І. Шумілава** ў час сустрэчы.

Фота **В. Дудко.**

# ТАЯМНІЦЫ «ШТУЧНАГА ІНТЭЛЕКТУ»

У лютым у Ленінградзе праходзіла І Міжрэспубліканская студэнцкая навукова-тэхнічная канферэнцыя «Штучны інтэлект. Тэорыя і практыка», на якой прысутнічала больш двухсот удзельнікаў ад 42 ВНУ нашай краіны. Былі зроблены цікавыя даклады па праблемах стварэння і кіравання робатамі, аўтаматызацыі кіравання вытворчымі працэсамі, распазнавання вобразаў.

Звычайна мы ўяўляем сабе робатаў як механічных людзей. Такія яны ў фантастычных кнігах і фільмах. Аднак існуючыя зараз робаты па знешняму выгляду менш за ўсё падобны на людзей, звычайна гэта пульт кіравання і адна ці некалькі металічных «рук». Аператар з дапамогай пульта загадвае робату, што трэба зрабіць (напрыклад, узяць паддон, пакласці на яго ідучыя па транспарцёру цагліны, прыняць нагружаны паддон). Затым робат укладвае цагліны, пакуль яго не спыніш. Аднак варта пакласці цагліну на край транспарцёра, і робат яе не знойдзе. Адбываецца гэта з-за адсутнасці органаў пачуццяў у робата. Зараз ствараюцца робаты, якія валодаюць «зрокам» і «пачуццём дотыку», «слыхам», але пакуль іх выкарыстанне абыходзіцца даражэй, чым выкарыстанне працы чалавека, і таму яны яшчэ не ўжываюцца ў прамысловасці.

Саветам Міністраў СССР прынят план работы па робатабудаванню, а таксама зацверджан шэраг прадпрыемстваў, НДІ і ВНУ для правядзення гэтых работ.

Студэнты таксама імкнуцца ўдзельнічаць у рабоце. У прыватнасці, у МДУ студэнцкімі калектывамі ствараюцца праграмы, якія дазваляюць ЭВМ пісаць для сябе праграмы, разумець натуральную чалавечую мову (выбіраць з яе інфармацыю, будаваць мадэль знешняга свету, затым, аналізуючы гэтую мадэль, узбагачаць свае веды).

Ад нашага універсітэта былі пададзены дзве работы: «Стварэнне вучэбных праграм для антаганістычнай гульні» Ю. Сцёпіна (III курс ФПМ) і «Ужыванне эўрыстычнага праграміравання пры вырашэнні інжынерных задач», якую падрыхтаваў аўтар. Абедзве яны былі зроблены пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў аддзела дыялогавых сістэм ВЦ БДУ імя У. І. Леніна, дзе праводзяцца, у прыватнасці, работы па стварэнню штучнага інтэлекту.

**М. РОЗАЎ,**
**удзельнік канферэнцыі, студэнт V курса механіка-матэматычнага факультэта.**

# Выхоўваць гарманічна развітага чалавека. Як?

**Артыкул пад такой назвай быў змешчан у нашай газеце 2 снежня 1976 года. У ім на прыкладзе дзейнасці студэнцкага клуба ўзнімаліся важныя праблемы грамадска-палітычнага і маральнага выхавання студэнтаў. Размову пра клуб і звязаныя з ім выхаваўчыя працэсы працягваюць сёння нашы чытачы.**

**ПРАЦЯГВАЕМ РАЗМОВУ**

## ШТО ЗДЫМАЕ ПРАБЛЕМУ?

Я згодна з думкай, што вучэбны працэс — гэта аснова выхавання. Тым не менш проста заняткаў — няхай нават тых, што нясуць максімум ведаў — недастаткова для поўнага развіцця асобы.

Уключаючыся ў гутарку аб выхаванні гарманічна развітага чалавека, мне хацелася б расказаць аб студэнцкім, дакладней, курсанцкім клубе Мінскага вышэйшага інжынернага зенітна - ракетнага вучылішча, дзе культурна-масавая работа знаходзіцца на высокім узроўні.

— У мастацкай самадзейнасці вучылішча, — расказвае сакратар камітэта камсамола ВІЗРВ, — прымае ўдзел 60—70 працэнтаў курсантаў з кожнага факультэта. Практычна ў нас на кожным курсе — свой вакальна - інструментальны ансамбль.

Пры клубе працуе кафэ, ёсць шахматны, танцавальны гурткі, гурток сольных спеваў, харавы, фотааматараў. Самы масавы — гурток бальнага танца. Пры ім — студыя сучасных рытмаў. Толькі ў гэтым годзе тут вучацца правільна і прыгожа танцаваць 112 чалавек. Студыйцы — частыя госці на прадпрыемствах Мінска.

Кожную нядзелю ў 9.30 пачынае сваю работу «Лекторый выхаднога дня». Надоўга запомняцца курсантам расказы генерал - лейтэнанта І. Жыгараза, дэлегата III з'езда камсамола В. Разанава і іншых. Ні адно мерапрыемства (ленінскія ўрокі, ленінскія чытанні, уручэнне камсамольскіх білетаў і. г. д.) не праходзіць без удзелу ветэранаў вайны і працы, пісьменнікаў БССР.

У ВІЗРВ створаны амаль усе ўмовы для асабістых зносін. Кожную суботу і нядзелю ў клубе праходзяць тэматычныя вечары. Курсанты запрашаюць на іх студэнтаў навучальных устаноў Мінска. Цесныя вузы сяброўства звязваюць вучылішча з Белдзяржуніверсітэтам, інстытутам народнай гаспадаркі, педінстытутам імя А. М. Горкага, тэхнікумамі.

Асаблівай увагі заслугоўвае ваенна - навуковае таварыства, дзе курсанты вядуць навукова-даследчую работу. Вялікую цікавасць выклікае так званая «радыёшкола».

Не ведаю, згодзяцца са мной ці не, але лічу, што іменна адсутнасць праблемы памяшкання для заняткаў знімае і праблему наведваемасці.

У курсанцікм клубе вядзецца сістэматычная работа па выхаванню чалавека новага грамадства.

Хацелася б, каб такім жа цікавым, змястоўным, знаходлівым быў клуб нашага універсітэта.

**Т. СКАБЕЛЬСКАЯ,**
**студэнтка III курса факультэта журналістыкі.**

## КАФЭ ПАТРЭБНА

Мой сябар вучыцца ў Мардоўскім універсітэце. Прыехаў да мяне на Кастрычніцкія святы. Схадзілі мы з ім у тэатр, хацелі дзе-небудзь патанцаваць, але... Тады ён кажа: «Пойдзем у кафэ. У нас ва універсітэце ёсць студэнцкае кафэ. Кожную суботу збіраецца моладзь, каб весела адпачыць, прыняць удзел у конкурсах, паспрачацца, падыскуціраваць. А ў вас як?»

Я прамаўчаў. Толькі падумаў, што гэта вельмі добра — сваё студкафэ. Можна было б зрабіць эстраду — на электрагітарах ігралі б нашы хлопцы. А ўсё астатняе — як на тэлевізійным «блакітным агеньчыку».

Па-мойму, можна было б часткова вырашыць праблему знаёмства юнакоў і дзяўчат. А то сапраўды — дзе пазнаёмішся са студэнтамі іншых факультэтаў? У інтэрнатах танцы рэдкія, ды я, увогуле, у інтэрнаце не жыву. А ў бібліятэцы ўсе заняты справамі. Вось вечарамі і блукаеш па кінатэатрах.

Дзе арганізаваць такое кафэ? Можна ў адным з інтэрнатаў. Калі атрымаецца добра, будуць прыходзіць студэнты адусюль, і ўсім будзе весела.

А так — сумнавата: лекцыі ды бібліятэка. А дадому ж часта ездзіць не будзеш.

Калі ўжо газета напісала пра магчымасць арганізацыі студкафэ, то мая думка такая: яно патрэбна і неабходна.

**А. КАСАРОЎ,**
**студэнт.**

